**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«14/18»**

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ НА ПОЗНЕСЯРЭДНЕВЯКОВЫМ МОГІЛЬНІКУ КАЛЯ в. МІХАЛІНАВА ЛЁЗНЕНСКАГА РАЁНА Ў 2016 г.

***канд. гіст. навук В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Артыкул прысвечаны апісанню археалагічных раскопак на познесярэдневяковым грунтовым могільніку каля вёскі Міхалінава Лепельскага раёна ў 2016 г. Было адкрыта 26 пахаванняў, якія ўтрымлівалі парэшткі не менш, чым 32 індывідаў (9 мужчын, 8 жанчын, 5 дзяцей, 8 дарослых неўстаноўленага полу і 2 індывідаў, чый пол і ўзрост не вызначаны). Пахаванні размешчаны на рознай глыбіні ў 4 гарызонтах. Касцякі арыенціраваны галавой на захад (3 пахаванні), у тым ліку з адхіленнямі да поўначы (11 пахаванняў) і да поўдня (3 пахаванні). У запаўненні магільных ям 15 пахаванняў выяўлены рэшткі трун. Пахавальны інвентар выяўлены ў 2 пахаваннях і прадстаўлены нацельнымі крыжыкамі. Таксама знойдзены крыжык, пярсцёнак, дэталь галаўнога ўбору, 2 манеты (верагодна, з парушаных пахаванняў). У культурным слаі могільніка прадстаўлены фрагменты керамікі XV – XIX стст.*

***Ключавыя словы:*** *Беларускае Падзвінне, археалагічныя даследаванні, пахавальныя помнікі XV – XVIII стст., пахаванні, пахавальны інвентар.*

**Уводзіны.** Пахавальныя помнікі Беларусі XIV – XVIII стст. да XX ст. не былі прадметам мэтанакіраваных даследаванняў. Яны даследаваліся пераважна пры выпадковым выяўленні або пры вывучэнні шматслойных помнікаў. У выніку аб пахавальным абрадзе Позняга Сярэдневякоўя – Новага часу мы ведаем недастаткова. Для рэканструкцыі пахавальнай практыкі згаданага перыяду найбольш інфарматыўнымі і шматлікімі з’яўляюцца археалагічныя крыніцы, таму археалагічнае вывучэнне познесярэдневяковых пахавальных помнікаў і публікацыя матэрыялаў палявых даследаванняў застаецца перспектыўным напрамкам айчыннай археалагічнай і гістарычнай навукі. Адным з такіх помнікаў стаў могільнік каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці.

**Асноўная частка. Апісанне могільніка.** Могільнік знаходзіцца пасярэдзіне в. Міхалінава і складаецца з дзеючай і старой частак. Старая частка знаходзіцца на паўночнай ускраіне могілак, да нядаўняга часу выкарыстоўвалася як могілкавы сметнік, а зараз засвойваецца пад сучасныя пахаванні. На старой частцы могілак знаходзіўся каменны крыж з высечаным знакам (крыжам з паўсферай над ім). Такія крыжы выступаюць у ролі маркёраў пахаванняў Позняга Сярэдневякоўя – Новага часу, таму намі было прынята рашэнне правесці на могільніку археалагічныя раскопкі. Раскопкі праводзіліся сіламі студэнтаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і валанцёраў[1].

**Апісанне раскопа.** На старой частцы могілак быў разбіты раскоп плошчай 20 м$^2$, арыенціраваны па баках свету. Ён закладаўся з разлікам, каб уключыць каменны крыж і камень прыкладна ў 6 м на паўднёвы захад ад крыжа, які мог адносіцца да надмагільнай канструкцыі. Раскоп быў разбіты на квадраты 2 × 2 м і даследаваўся ўмоўнымі пластамі па 0,2 м. Стратыграфія мела наступны выгляд. Пад слоем дзёрану знаходзілася праслойка цёмнай, насычанай арганікай глебы магутнасцю каля 0,2 м. Яна была перамяшана са смеццем (дротам і кветкамі ад вянкоў, бітымі шклянымі бутэлькамі). Пад ёй ляжаў слой жоўтага пяску з плямамі шэра-жоўтага колеру (слядамі шматлікіх перакопаў). Мацярык прадстаўлены светлым, бледна-жоўтым пяском. На ўсю глыбіню слоя сустракаліся фрагменты керамікі і асобныя косці. Пасля завяршэння работ раскоп быў засыпаны.

**Апісанне каменных надмагілляў.** На ўзроўні дзённай паверхні надмагіллі былі прадстаўлены каменным крыжам у квадраце А1 і каменем у квадраце В1 (малюнак 1). Каменны крыж быў нахілены на паўночны бок і ўрос у зямлю па перакладзіну. Ніжняя частка лапасцей знаходзілася ў зямлі. З усходняга боку на ім бароздкамі быў высечаны знак (крыж з паўсферай над ім), які візуальна нагадваў парасон. Вышыня наземнай часткі крыжа складала 0,5 м над узроўнем дзённай паверхні. Агульная вышыня крыжа (устаноўлена пасля таго, як крыж быў вынуты з зямлі) склала 1,01 м, шырыня лопасцей 0,67 м. Каменны

[1] Аўтар выказвае падзяку: Дз.І. Казлову за дапамогу ў арганізацыі даследаванняў, намесніку старшыні Лёзненскага райвыканкама І.А. Дзерваед, кіруючаму справамі райвыканкама А.М. Ганчарову, дырэктару раённага ваенна-гістарычнага музея В.М. Самушчанка, старшыні Веляшковіцкага сельсавета Л.І. Васільковай – за ўсебаковае спрыянне археалагічнай экспедыцыі, удзельнікам раскопак: Л. Аверчанка, А. Бурштэйну, А. Доўгай, А. Жылачу, А. Контаравай, П. Круку, А. Пестун, К. Салуніну, Дз. Сядлецкаму, А. Трошка, А. Усцін, Ю. Харытонавай, М. Шчамялёву, П. Ястрэмскаму – за руплівую і добрасумленную працу, І. Камінскаму, А. Коцу, Л. Калбека – за дапамогу ў камеральнай апрацоўцы матэрыяла.

крыж суадносіцца з пахаваннем 3 і знаходзіўся ў нагах магілы, але можа адносіцца і да аднаго з суседніх парушаных пахаванняў.

Камень у квадраце В1 (гл. малюнак 1) аказаўся верхняй часткай каменнай пліты 1 падавальнай формы вышынёй 0,86 м і шырынёй 0,46 м (у самай шырокай частцы). На пліце з усходняга боку быў высечаны васьміканцовы крыж з касой перакладзінай. Малюнак зроблены дзвюма двайнымі бароздкамі з прамежкам паміж імі, якія ўтвараюць контур крыжа. Пліта суадносіцца з пахаваннем 8, але магла абазначаць і суседнія пахаванні 10 ці 26.

На ўзроўні ўмоўнага пласта 2 (0,2–0,4 м ад узроўню дзённай паверхні) на мяжы квадратаў Г1–Г2 знойдзена каменная пліта 2. Яна знаходзілася ў паваленым стане, плоскім бокам уніз. Пліта мела падпрамавугольную форму. Яе памеры складалі 0,75 м у вышыню і 0,42 м у шырыню. На пліце бароздкамі быў высечаны васьміканцовы крыж з касой перакладзінай, узяты ў контур накшталт гербавага шчыта. Пліта суадносіцца з пахаваннем 12.




**Малюнак 1. – Могільнік каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна. План каменных канструкцый**

На ўзроўні ўмоўнага пласта 3 на мяжы квадратаў А1–А´1 выяўлены камень. На ўзроўні ўмоўнага пласта 4 побач былі знойдзены 2 фрагменты жорнаў. Магчыма, яны ўтваралі незамкнёную абкладку або былі пакладзены для ўмацавання асновы крыжа ў якасці яго «падмурку». Яшчэ адзін камень знаходзіўся ў паўднёвай сценцы квадрата А´1 на ўзроўні ўмоўнага пласта 4 (гл. малюнак 1).

**Апісанне пахаванняў.** У межах раскопа было адкрыта 26 пахаванняў, якія размяшчаліся на рознай глыбіні ў 4-х гарызонтах. Да першага гарызонта аднесены пахаванні 1 і 11, што знаходзіліся на глыбіні да 0,79 м (тут і далей даецца глыбіня ад узроўню дзённай паверхні); да другога – пахаванні 2, 6–10, 12–13, выяўленыя на глыбіні да 1,03 м, да трэцяга – пахаванні 3–5, 22, 24–25, адкрытыя на глыбіні да 1,45 м, да чацвёртага гарызонту адносіліся пахаванні 14–21, 23, 26, якія знаходзіліся на глыбіні да 1,89 м. Пахаванні пашкоджаны шматлікімі перакопамі, магільныя ямы практычна не чыталіся, што ўказвае на працяглае выкарыстанне даследаванай часткі могільніка. Анатамічны парадак касцей у большасці з іх парушаны. Акрамя таго, у культурным слаі па-за магіламі выяўлена значная колькасць скапленняў касцей і асобных касцей пашкоджаных касцякоў.

Прасочана арыенціроўка 17 пахаванняў. Тры з іх арыенціравана на захад, 11 – на захад з адхіленнем да поўначы, 2 – на паўднёвы захад, 1 – на захад з адхіленнем да поўдня. Пераважае агульны напрамак адхілення да поўначы. Палажэнне рук прасочана для 6 пахаванняў. У двух рукі складзены на жываце пад грудзямі, у двух – адна рука знаходзілася на жываце пад грудзямі, а другая ляжала на тазавых касцях або на грудзях, у двух захавалася толькі адна рука, якая ляжала на жываце пад грудзямі. Антрапалагічная экспертыза праводзілася канд. біял. навук, дацэнтам В.А. Емяльянчык [1][2]. Па выніках экспертызы, астэалагічны матэрыял належаў не менш чым 31 індывіду, у тым ліку 9 мужчынам, 8 жанчынам, 5 дзецям, 8 дарослым неўстаноўленага полу і 2 індывідам, пол і ўзрост якіх не быў вызначаны з-за нездавальняючай захаванасці парэштак.

*Пахаванне 1* (малюнак 2) знаходзілася ў квадратах А1, А´1, А2 на глыбіні 0,79 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала дзіцяці ва ўзросце 3 гадоў. Зыходзячы з

[2] Аўтар выказвае падзяку кандыдату біялагічных навук, дацэнту В.А. Емяльянчык за праведзеную антрапалагічную экспертызу.

размяшчэння касцей і контураў магілы, шкілет арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена.

*Пахаванне 2* (гл. малюнак 2) размяшчалася ў квадраце Б1 на глыбіні 1,08 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па выніках экспертызы належала дзіцяці ва ўзросце 12–15 гадоў. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. У засыпцы магілы знаходзіўся невялікі фрагмент вугалю.

*Пахаванне 3* (малюнак 3) выяўлена ў квадратах А1, А´1 на глыбіні 1,33 м і па даных антрапалагічнай экспертызы належала дарослому індывіду ва ўзросце 18–20 гадоў. Шкілет арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Правая рука пакладзена на жываце пад грудзямі, косці левай рукі адсутнічалі. У магільнай яме зафіксаваны 2 цвікі ад труны. У раёне ног над пахаваннем знаходзіўся каменны крыж. Не выключана, што згаданыя валуны і каменны крыж маглі адносіцца да суседніх парушаных пахаванняў.




**Малюнак 2. – Могільнік каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна. План пахаванняў. Гарызонты 1–2**




**Малюнак 3. – Могільнік каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна. План пахаванняў. Гарызонт 3**

*Пахаванне 4* (гл. малюнак 3) знаходзілася ў квадраце А1 на глыбіні 1,22 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала дзіцяці 10–12 год. Арыенціроўка, палажэнне рук не ўстаноўлены. У магіле зафіксавана 8 цвікоў ад труны.

*Пахаванне 5* (гл. малюнак 3) размяшчалася ў квадратах А1, А´1 на глыбіні 1,13 м і па выніках антрапалагічнай экспертызы належала даросламу чалавеку ва ўзросце ад 20 гадоў. Зыходзячы з размяшчэння касцей і контураў магілы, шкілет быў арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Левая рука пакладзена на жываце пад грудзямі, косці правай знойдзены збоку ад касцяка.

*Пахаванне 6* (гл. малюнак 2) выяўлена ў квадраце Б2 на глыбіні 1,0 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па даных антрапалагічнай экспертызы належала мужчыне (?) ва ўзросце ад 20 гадоў. Зыходзячы з контураў магілы, пахаванне было арыенціравана галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магільнай яме зафіксавана 17 цвікоў ад труны.

*Пахаванне 7* (гл. малюнак 2) знаходзілася ў квадраце В2 на глыбіні 1,0 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала жанчыне (?) ва ўзросце ад 20 гадоў. Зыходзячы з контураў магілы, пахаванне было арыенціравана галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магільнай яме зафіксаваны дошкі ад труны.

*Пахаванне 8* (гл. малюнак 2) размяшчалася ў квадраце В2 на глыбіні 0,92 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па выніках антрапалагічнай экспертызы ўтрымлівала парэшткі двух жанчын ва ўзросце 18–20 і больш за 50 гадоў. Магільная яма арыенціравана на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магільнай яме зафіксаваны дошкі і 16 цвікоў ад труны. Магчыма, пахаванне было абазначана каменнай плітой 1, якая размяшчалася на адлегласці каля 1 м ад магілы. Не выключана, што згаданая пліта адносілася да пахаванняў 10 або 26.

*Пахаванне 9* (гл. малюнак 2) выяўлена ў квадраце Г2 на глыбіні 1,01 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па даных антрапалагічнай экспертызы ўтрымлівала парэшткі двух жанчын ва ўзросце 30–40 гадоў. Шкілет арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Магільная яма арыенціравана на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магільнай яме зафіксаваны дошкі ад труны.

*Пахаванне 10* (гл. малюнак 2) знаходзілася ў квадраце В1 на глыбіні 1,03 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала даросламу ва ўзросце ад 50 год. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. У магільнай яме зафіксаваны дошкі ад труны.

*Пахаванне 11* (гл. малюнак 2) размяшчалася ў квадраце А2 на глыбіні 0,6 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па выніках экспертызы належала жанчыне ва ўзросце 18–20 гадоў. Зыходзячы з размяшчэння касцей і контураў магілы, шкілет арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магільнай яме зафіксаваны 3 цвікі ад труны.

*Пахаванне 12* (гл. малюнак 2) выяўлена ў квадраце Г2 на глыбіні 1,0 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па даных экспертызы належала 3-гадоваму дзіцяці. Зыходзячы з контураў магілы, пахаванне было арыенціравана галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена. Магчыма, пахаванне было абазначана каменнай плітой 2, якая знойдзена над ім у паваленым стане.

*Пахаванне 13* (гл. малюнак 2) знаходзілася ў квадраце Б1 на глыбіні 0,99 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле экспертызы належала даросламу ва ўзросце ад 20 гадоў. Зыходзячы з размяшчэння касцей і контураў магілы, шкілет арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Палажэнне рук не ўстаноўлена.

*Пахаванне 14* (малюнак 4) размяшчалася ў квадратах А1 і Б 1 на глыбіні 1,53 м. Касцяк не захаваўся. Палажэнне рук не ўстаноўлена. У магіле прысутнічалі дошкі і 21 цвік ад труны, арыенціраванай на захад з адхіленнем да поўначы.




**Малюнак 4. – Могільнік каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна. План пахаванняў. Гарызонт 4**

*Пахаванне 15* (гл. малюнак 4) выяўлена ў квадраце А1 на глыбіні 1,73 м і належала мужчыне (?) 30–40 гадоў. Арыенціроўка – галавой на паўднёвы захад з адхіленнем да поўдня. Палажэнне рук невядома.

*Пахаванне 16* (гл. малюнак 4) знаходзілася ў квадраце А2 на глыбіні 1,42 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала індывіду ва ўзросце 14–20 год. Арыенціроўка і палажэнне рук не прасочаны.

*Пахаванне 17* (гл. малюнак 4) размяшчалася ў квадраце А´1 на глыбіні 1,5 м і па выніках антрапалагічнай экспертызы належала жанчыне ва ўзросце 18–20 гадоў. Шкілет арыенціраваны галавой на паўднёвы захад. Кісць правай рукі пакладзена на тазавыя косці, левая рука знаходзілася на жываце пад грудзямі.

*Пахаванне 18* (гл. малюнак 4) выяўлена ў квадратах Б1 і В1 на глыбіні 1,68 м і па даных антрапалагічнай экспертызы належала мужчыне (?) ва ўзросце 18–20 гадоў. Касцяк арыенціраваны галавой на захад. Рукі пакладзены на жываце пад грудзямі. Інвентар прадстаўлены нацельным крыжыкам з меднага сплаву. У магільнай яме зафіксаваны дошкі і 36 цвікоў ад труны.

*Пахаванне 19* (гл. малюнак 4) знаходзілася ў квадраце Б1 на глыбіні 1,79 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы належала даросламу ва ўзросце 40–50 гадоў. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. У магільнай яме зафіксаваны цвік ад труны.

*Пахаванне 20* (гл. малюнак 4) размяшчалася ў квадраце Б1 на глыбіні 1,89 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па выніках антрапалагічнай экспертызы належала мужчыне (?) ва ўзросце звыш 40 гадоў. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены.

*Пахаванне 21* (гл. малюнак 4) выяўлена ў квадраце А´1 на глыбіні 1,68 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па даных антрапалагічнай экспертызы ўтрымлівала парэшткі двух людзей: мужчыны (?) ва ўзросце звыш 50 гадоў і чалавека, чый пол і ўзрост не быў устаноўлены з-за дрэннага стану захаванасці касцей. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. У магільнай яме зафіксавана 12 цвікоў ад труны.

*Пахаванне 22* (гл. малюнак 3) знаходзілася ў квадраце А´1 на глыбіні 1,45 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы ўтрымлівала парэшткі двух людзей: мужчыны ва ўзросце звыш 60 гадоў і індывіда ва ўзросце 15–18 гадоў. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. У магільнай яме зафіксаваны 4 цвікі ад труны.

*Пахаванне 23* (гл. малюнак 4) размяшчалася ў квадраце Б1 на глыбіні 1,86 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па выніках антрапалагічнай экспертызы належала мужчыне ва ўзросце 20–30 гадоў. Шкілет арыенціраваны галавой на захад. Рукі пакладзены на жываце пад грудзямі. Інвентар прадстаўлены нацельным крыжыкам з меднага сплаву. У магільнай яме зафіксаваны дошкі і 25 цвікоў ад труны.

*Пахаванне 24* (гл. малюнак 3) выяўлена на мяжы квадратаў В2 і Г2 на глыбіні 1,44 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і па даных антрапалагічнай экспертызы належала дзіцяці ва ўзросце 3-х гадоў. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены.

*Пахаванне 25* (гл. малюнак 3) знаходзілася ў квадратах Б2 і В2 на глыбіні 1,37 м, прадстаўлена асобнымі касцямі і паводле антрапалагічнай экспертызы ўтрымлівала парэшткі трох чалавек: мужчыны (?) ва ўзросце 30–40 гадоў, жанчыны ва ўзросце 18–20 гадоў і індывіда ва ўзросце 15–18 год. Арыенціроўка і палажэнне рук не ўстаноўлены. Над пахаваннямі ў перакопе зафіксавана 19 цвікоў, скаба ад труны і манета (2 капейкі Расійскай імперыі 1884 г.).

*Пахаванне 26* (гл. малюнак 4) размяшчалася ў квадраце В1 на глыбіні 1,71 м і па выніках антрапалагічнай экспертызы належала мужчыне ва ўзросце звыш 50 год. Касцяк арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўдня. Правая рука знаходзілася на грудзях, левая пакладзена на жываце пад грудзямі паверх левай.

**Апісанне знаходак.** Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены трыма нацельнымі крыжыкамі XVIII – XIX стст. з меднага сплаву, дзвюмя манетамі XIX ст., казырком ад галаўнога ўбору, а таксама цвікамі і скабой ад трун. Два нацельных крыжыка выяўлены ў пахаваннях 18 і 23. Яшчэ 1 крыжык, пярсцёнак з меднага сплаву і манета (2 капейкі Расійскай імперыі 1844 г.) знойдзены над пахаваннем 25, але не адносіліся да яго. Там жа знойдзены фрагмент косткі фалангі пальца, афарбаваны вокісламі зялёнага колеру (магчыма, ад гэтага пярсцёнка). Па-за магіламі выяўлены скураны казырок ад галаўнога ўбору, які, магчыма, адносіўся да пахавання 23. Пад магільнай плітой 1 знойдзена яшчэ адна манета (2 капейкі Расійскай імперыі 1822 г.).

Рэшткі драўніны ад трун выяўлены ў 3-х пахаваннях, цвікі – у 8-мі, рэшткі драўніны і цвікі – у 4-х. Частка цвікоў выяўлена па-за магіламі і паходзіць ад парушаных пахаванняў. Усяго знойдзена 166 цвікоў і 1 скаба ад трун.

Масавыя знаходкі прадстаўлены шматлікімі фрагментамі керамікі (2101 фрагмент) XV, XVI – XVII, XVIII – XIX стст. Колькасць фрагментаў керамікі на парадкі пераўвышае колькасць аналагічных знаходак на іншых грунтовых могільніках Позняга Сярэдневякоўя – Новага часу. Нехарактэрным для іншых могільнікаў з’яўляецца таксама размеркаванне керамікі па ўмоўных пластах. Звычайна, яна сустракаецца ў верхніх умоўных пластах на глыбіні да 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні (могільнікі Доўгае, Дубраўка, Жарнасекава, Івесь, Клешчына, Новы Болецк, Туржэц-2) [2, с. 137; 3, с. 261–266; 4, с. 6–7; 5, с. 183–186]. На могільніку Міхалінава фрагменты керамікі сустракаліся да мацерыка. Гэта абумоўлена шматлікімі перакопамі. Пры перамешванні культурнага слоя фрагменты посуду перамяшчаліся на розную глыбіню.

**Заключэнне.** Такім чынам, у ходзе археалагічных раскопак на могільніку каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна ў 2016 г. быў закладзены раскоп плошчай 20 м$^2$. Было даследавана 26 пахаванняў, якія ўтрымлівалі парэшткі не менш чым 32-х чалавек. Пахаванні знаходзіліся ў 4-х гарызонтах і былі парушаны шматлікімі перакопамі. Два з іх былі абазначаны каменнымі плітамі з высечанымі крыжамі, адно – каменным крыжам з высечаным знакам (крыжам і паўсферай). Інвентар выяўлены ў двух пахаваннях і прадстаўлены двума нацельнымі крыжыкамі XVIII – XIX стст. з меднага сплаву. Манета 1822 г. знойдзена пад

каменнай плітой. Яшчэ адзін крыжык, пярсцёнак, манета 1884 г. і скураны казырок ад галаўнога ўбору знойдзены па-за магіламі. У 15-ці пахаваннях выяўлены рэшткі дашчатых трун, змацаваных цвікамі. Колькасць трун была большай, на што ўказваюць знаходкі цвікоў па-за магіламі. Памінальны інвентар прадстаўлены фрагментамі керамікі XV – XIX стст. Такім чынам, даследаваныя пахаванні датуюцца XVIII – XIX стст., але могільнік пачаў існаванне ў больш ранні час і дзейнічаў на працягу XV – XIX стст.

ЛІТАРАТУРА


1. Емяльянчык, В.А. Вынікі антрапалагічнай экспертызы астэалагічных матэрыялаў з грунтовага могільніка каля вёскі Міхалінава Лёзненскага раёна (раскопкі В.У. Чараўко, 2016 г.) / В.А. Емяльянчык // Навуковая справаздача аб правядзенні археалагічных раскопак на могільніку каля в. Міхалінава Лёзненскага раёна і археалагічных разведак каля вв. Грабенікі Лёзненскага і Станкавічы Браслаўскага раёнаў Віцебскай вобласці ў 2016 г. / В.У. Чараўко. – [На разглядзе ў Палявым камітэце].
2. Ляўко, В.М. Новы Болецк / В.М. Ляўко // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. – Т. 2.: Л – Я / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2011. – С. 137.
3. Дук, Д.У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д.У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2008. – № 15. – С. 261–269.
4. Черевко, В.В. Поминальный инвентарь сельских погребальных памятников Белорусского Подвинья XIV–XVIII вв. и вопросы его интерпретации в свете данных археологии и этнографии / В.В. Черевко // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. по материалам Междунар. науч. конф., Пинск, 21–22 окт. 2016 г. – Пинск, 2016. – С. 6–9.
5. Черевко, В. В. Внемогильный инвентарь позднесредневековых погребений могильника Михалиново Лиозненского района и его информативность / В. В. Черевко // Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 200-летию И. Е. Храповицкого, Верхнедвинск, 16 июня 2017 г. ; редкол.: В.А. Ганский (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Белнаучкнига, 2017. — С. 183–186.


*Паступіў 17.12.2020*

**THE ARCHAEOLOGICAL EXCAVATIONS AT THE LATE-MEDIEVAL CEMETERY NEAR MIKHALINAVA VILLAGE OF LIOZNA DISTRICT IN 2016**

***V. CHARAUKO***

*The article describes archaeological excavations at the ground cemetery near Mikhalinava village of Liozna district in Vitebsk region in 2016. 26 burials that contained the remains of at least 32 people (probablyg 9 men, 8 women, 5 children, 8 and people, whose sex could not be determined and 2 people, whose sex and age could not be determined) were open. Burials were placed in four layers. The heads of skeletons are oriented to the West (3 burials), to the West with deviation to the North (11 burial), and to the West with deviation to the South (3 burials). Remains of coffins have been found in in the filling of grave pits of 15 burials. A crosses have been found in 2 burials. Fragments of pottery from the 15th to the 19th centuries were discovered.*

***Keywords:*** *Belarusian Dvina region, archaeological excavations, funerary monuments of the 15th–18th centuries, burials, grave goods.*